














Нараджэнне Ісуса

Гісторыя з Божага Слова, Бібліі

знаходзіцца ў

Мацьвея 1-2, Лукі 1-2

"Сведчанне словаў Тваіх прасвятляе."
Псалтыр 119:130

Аўтар Edward Hughes
Ілюстратар M. Maillot

Пераклаў Christian Lingua
Адаптаваў E. Frischbutter; Sarah S.

**Гісторыя 36 з 60**

**M1914.org**

**Bible for Children, PO Box 3, Winnipeg MB R3C 2G1 Canada**

Ліцэнзія: Вы маеце права капіяваць ці друкаваць гэтую гісторыю, але не ў камерцыйных мэтах (не прадаваць яе).

Бог ведае, што мы рабілі дрэнныя справы, якія Ён называе грахом. Пакаранне за грэх – гэта смерць.

Бог любіць нас так моцна, што Ён паслаў Свайго Сына, Ісуса, каб памерці на крыжы і аплаціць нашае пакаранне замест нас. Ісус уваскрэс з мёртвых і вярнуўся на нябёсы! Цяпер Бог можа прабачыць нашыя грахі.

Калі вы хочаце адвярнуцца ад вашых грахоў, тады скажыце Богу: Гасподзь, я веру, што Ісус памёр за мяне і цяпер зноў жывы. Калі ласка, увайдзі ў маё жыццё і прабач мае грахі, каб я мог мець новае жыццё цяпер, а потым быць з Табой назаўжды. Дапамажы мне жыць для Цябе, як Тваё дзіцё. Амін. Ян 3:16

Чытайце Біблію і размаўляйце з Богам кожны дзень!

Беларуская Belarusian







"Як гэта можа быць?" – запытала дужа ўражаная дзяўчына, – "я яшчэ не была ні з адным мужчынам". Анёл сказаў Марыі, што дзіця з'явіцца ад Бога. Зямны бацька не будзе ў гэтым удзельнічаць.
3
Затым анёл сказаў Марыі, што яе сваячка Елізавета хутка народзіць дзіця, нягледзячы на старасць. Гэта таксама быў цуд. Неўзабаве Марыя наведала Елізавету. Яны разам праславілі Бога.
4
Марыя была заручаная з мужчынам па імені Іосіф. Іосіфу стала сумна, калі ён даведаўся, што Марыя чакае дзіця. Ён падумаў, што нейкі іншы мужчына быў бацькам.
5
Анёл Божы ў сне сказаў Іосіфу, што гэтае дзіця было Сынам Божым. Іосіф павінен быў дапамагчы Марыі даглядаць за Ісусам.
6
Іосіф паверыў Богу і паслухаўся Яго. Ён таксама падпарадкоўваўся законам сваёй краіны. У той час быў выдадзены новы закон, згодна якому Іосіф і Марыя павінны былі
пайсці ў свой родны горад, Віфлеем, каб заплаціць падаткі.
7
Марыя ўжо была гатовая нарадзіць дзіця. Але Іосіф нідзе не мог знайсці вольны пакой. Усе гатэлі былі перапоўненыя.
8
Нарэшце, Іосіф знайшоў хлеў. Там, немаўлятка Ісус і нарадзіўся. Ягоная маці паклала яго ў яслі, месца, дзе звычайна ставілі ежу для жывёлін.
9
Непадалёк пастухі ахоўвалі свае статкі авечак. Анёл Божы з'явіўся і сказаў ім радасную навіну.
10
"бо сёння нарадзіўся вам у горадзе Давідавым Збаўца, Які ёсць Хрыстос Гасподзь. Вы знойдзеце Дзіця, Яно ляжыць у яслях".
11
Раптам з'явілася мноства больш светлых анёлаў, якія ўслаўлялі Бога, кажучы: ...
12
... "слава ў вышынях Богу, і на зямлі мір, у людзях добрая воля".
13
Пастухі паспяшаліся да стайні. Убачыўшы Дзіцятка, яны пачалі распавядаць усім сустрэчным тое, што анёлы казалі пра Ісуса.
14
Праз сорак дзён Іосіф і Марыя прынеслі Ісуса ў храм у Ерусаліме. Там чалавек па імені Сымон праславіў Бога за Дзіцятка, а старая Ганна, іншая слуга Госпада, таксама падзякавала Богу за Ісуса.
15
Абодва ведалі, што Ісус быў Сын Божы, абяцаны Збаўца. Іосіф ахвяраваў дзве птушкі. Гэта ахвяра, якую, згодна з Божым законам, бедныя людзі павінны былі прынесці, калі яны прадстаўлялі нованароджанае дзіця перад Госпадам.
16
Праз некаторы час асаблівая зорка прывяла мудрацоў з усходняй
краіны ў Ерусалім. "Дзе Той, Хто нарадзіўся, Цар Юдэйскі?" – спыталі яны. "Мы хочам пакланіцца Яму".
17
Цар Ірад пачуў пра мудрацоў. Занепакоены, ён папрасіў іх сказаць яму, дзе знаходзіцца Ісус, калі яны знойдуць Яго. "Я таксама хачу Яму пакланіцца" – сказаў Ірад. Але ён хлусіў. Ірад хацеў забіць Ісуса.
18